З каталіцкіх СМІ Беларусі (9)

Аўтар: Рэдакцыя
21.02.2021 00:00

Інтэрнэт-партал
Касцёла ў Беларусі

Дэпартамент па гуманітарнай дзейнаці пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь не зарэгістраваў сродкі, прызначаныя на закуп хатніх жывёл, саджанцаў і прадуктаў для бяздомных і патрабуючых.

Дабрачынны праект ладзіць Рэлігійная місія “Дабрачыннае каталіцкае таварыства «Карытас»” Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі. У гэтым годзе планавалася дапамагчы каля 700 патрабуючым. Прычына нерэгістрацыі сродкаў невядомая. Супрацоўнікі рэлігійнай місіі тлумачэнняў не атрымалі.

Падтрымаць праекты дабрачыннага таварыства “Карытас” можна праз запыт USSD для абанентаў МТС *222*16# (сума 2 рублі), а таксама праз сістэму АРІП (нумар паслугі 434 9831): грамадскія аб’яднанні->дапамога дзецям, дарослым->Карытас Мінск->ахвяраванні. †

Рэлігійны часопіс

Чаму ў свеце існуе столькі зла? Чаму Бог не знішчыць створаны сабою свет, калі ў ім столькі благога? Напэўна, кожнага хоць раз у жыцці турбавалі гэтыя пытанні.

Зло – гэта наступства вольнай волі, якою Бог надзяліў чалавека. І няма ніякай неабходнасці знішчаць свет, бо дастаткова толькі таго, каб людзі дабравольна ўключаліся ў рэалізацыю Божых планаў, тады свет стане адной вялікай любячай сям’ёю.

Пан Бог неаднойчы папярэджваў чалавецтва аб магчымым знішчэнні свету. Ён рабіў гэта спачатку праз патоп і катаклізм Садома і Гаморы, далей – праз іншыя выпрабаванні.

Адначасова ва ўсіх выпадках Бог ратаваў усё, што добрае, каб пасля ачышчэння яно магло развівацца далей, узбагачанае балючым выпрабаваннем.

З каталіцкіх СМІ Беларусі (9)

Аўтар: Рэдакцыя
21.02.2021 00:00



